ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 7 (104) | Субота, 4 сакавіка 1972 г. | Год выдання 3-ці | Цана 2 кап.

# ПЛАНЕТА СА СВЯТАМ ВІНШУЕ ЖАНЧЫН

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

### ПАРТЫЙНЫ КАМІТЭТ

на сваім чарговым пасяджэнні разгледзеў пытанне аб прыёме ў члены КПСС М. І. Мацюшэнка і кандыдатам у члены КПСС У. У. Багамольнікава. Члены парткома аднагалосна зацвердзілі рашэнне пярвічнай партыйнай арганізацыі гісторыка-філалагічнага факультэта аб прыёме ў члены КПСС М. І. Мацюшэнка і кандыдатам у члены КПСС У. У. Багамольнікава.

Быў таксама разгледжан план навукова-даследчыцкай работы універсітэта на бягучы год, аб якім далажыў начальнік навукова-даследчыцкага сектара М. І. Твардоўскі.

Акрамя таго, быў абмеркаван шэраг арганізацыйных пытанняў.

### ВУЧОНЫ САВЕТ

Вучоны савет, пасяджэнне якога адбылося ў чацвер, 2 сакавіка, разгледзеў шэраг арганізацыйных пытанняў.

Быў зацверджаны новы састаў Вучонага савета нашага універсітэта. У яго ўвайшло трыццаць пяць чалавек.

Члены Вучонага савета рэкамендавалі да друку манаграфію загадчыка кафедры беларускай літаратуры доктара філалагічных навук М. М. Грынчыка, а таксама зацвердзілі знешні водгук на кандыдацкую дысертацыю.

Былі таксама абраны па конкурсе на вакантныя пасады прафесарска - выкладчыцкага саставу дацэнты, старшыя выкладчыкі і выкладчыкі.




## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

На сямі факультэтах дзённага аддзялення Гомельскага дзяржаўнага універсітэта навучаюцца 3246 студэнтаў, з іх 1900 жанчын.

Шэсць студэнтаў ГДУ атрымліваюць імянныя стыпендыі, чацвёра з іх — жанчыны. Ленінскімі стыпендыятамі з'яўляюцца студэнтка чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Надзея Шабан, студэнтка пятага курса фізічнага факультэта Ганна Гадлеўская і студэнтка пятага курса біёлага-глебавага факультэта Любоў Разуменка. Коласаўскую стыпендыю атрымлівае студэнтка пятага курса гісторыка — філалагічнага факультэта Святлана Стратовіч.

18 студэнтаў абраны ў састаў прафсаюзнага камітэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, восем з іх — жанчыны.

Тры прадстаўнікі ГДУ удзельнічалі ў рабоце Усесаюзнага злёту студэнтаў. Двое з іх — жанчыны.

□ □

Выдатніца вучобы, камсамольскі актывіст, чулы таварыш — так гавораць на біёлага-глебавым факультэце пра студэнтку чацвёртага курса Яніну Лялькову. Днямі ў яе жыцці адбылася хвалюючая падзея — дзяўчыну гамяльчане абралі дэпутатам гарадского Савета дэпутатаў працоўных.

На здымку: Яніна Лялькова (злева) на лабараторных занятках.

□ □



# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

## ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ДРУГОЕ ПАЎГОДДЗЕ 1971—1972 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

### ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага і эканамічнага жыцця ўнутры краіны і рэспублікі (2—3 разы ў месяц):

— Свята камуністычнай працы (15 красавіка — камуністычны суботнік, прысвечаны 102-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 50-годдзю СССР).

— У. І. Ленін — стваральнік СССР.

— Пятнаццаць раўнапраўных рэспублік-сясцёр.

— Кастрычнікам народжаны.

— СССР — 50 год.

— Утварэнне і развіццё СССР — перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі.

— Ленінскія прынцыпы ўтварэння шматнацыянальнай Савецкай дзяржавы.

— Вырашэнне нацыянальнага пытання ў СССР — найвялікшая заваёва сацыялізму.

— XXIV з'езд КПСС аб нацыянальных адносінах у перыяд камуністычнага будаўніцтва.

— Асноўная лінія эканамічнага развіцця СССР.

— Навуковыя асновы планавага кіравання народнай гаспадаркай.

— Павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці — карэннае пытанне эканамічнай палітыкі КПСС.

— Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і патрабаванні да прафесіянальных якасцей спецыялістаў.

— Пускавыя будоўлі другога года пяцігодкі.

— Магутная рухаючая сіла (аб перамозе ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС).

— Калектывізм — рыса камуністычная.

### ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

— Ленінскія прынцыпы барацьбы супраць буржуазнай ідэалогіі.

— Традыцыі партыі — сцяг моладзі.

— Крытэрый маралі і маральнай ацэнкі ўчынкаў чалавека.

— Сэнс жыцця і шчасце савецкага чалавека.

— Аб выхаванні класавай самасвядомасці моладзі.

— Рэвалюцыйная пільнасць — неад'емная якасць савецкага чалавека.

— Пралетарскі інтэрнацыяналізм і патрыятызм.

— Сённяшні дзень савецкага мастацтва.

— Крызіс рэлігіі ва ўмовах сучаснага грамадскага развіцця.

### ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях міжнароднага жыцця (2—3 разы ў месяц):

— Знешнепалітычная праграма XXIV з'езда КПСС — у дзеянні.

— Савецкая праграма абароны міру.

— Ленінскае вучэнне аб імперыялізме і сучаснасць.

— У адной запрэжцы з амерыканскім імперыялізмам. (Аб падыходзе Пекіна да вырашэння актуальных міжнародных праблем).

— Каланізатарскі разбой у Ольстэры.

— Асноўныя напрамкі антыімперыялістычнай барацьбы.

— Краіны сацыялізму ў барацьбе за еўрапейскую бяспеку.

— Амерыканскі імперыялізм — непрымірымы вораг вызваленчага руху.

— XXIV з'езд КПСС і міжнародны камуністычны рух.

— Барацьба моладзі краін капіталу супраць імперыялізму і неакаланіялізму.

— ФРГ: Барацьба вакол ратыфікацыі дагавораў з СССР і Польшчай.

— Бангладэш на шляху да ўмацавання нацыянальнай незалежнасці.

— Хто ўскладняе абстаноўку ў Міжземным моры?

